# Знакі прыпынку ў сказах
# з рознымі відамі сувязі частак

**С. В. Цярэшчанка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 13 г. Жлобіна імя В. В. Гузава

**Пры выкананні тэставых заданнў па баларуская мове, як паказвае практыка, асаблівую цяжкасць у навучэнцаў выклікаюць сказы з рознымі відамі сувязі. У 11 класе на паўтарэнне тэмы «Сінтаксічныя прыметы сказаў з рознымі відамі сувязі» адводзіцца дзве гадзіны. Далей з дадзенымі сказамі дзеці сустракаюцца толькі пры напісанні экзаменацыйнага пераказу і выкананні тэставага задання. Такім чынам, авалодаць на ўроку трывалымі навыкамі работы з такой разнавіднасцю складанага сказа для вучня дастаткова складана, таму настаўніку неабходна арганізоўваць правядзенне факультатыўных, падтрымліваючых і індывідуальных заняткаў, з выкарыстаннем сістэматызаваных матэрыялаў ЦТ.**

Для паспяховай здачы ЦТ вучань павінен добра ведаць правілы і ўсе выключэнні з правілаў. Умець іх выкарыстоўваць на практыцы.

Тэст па беларускай мове ахоплівае ўсе раздзелы мовы. Засяродзім увагу на раздзеле “Сінтаксіс” і “Пунктуацыя”.

У тэсце 13заданняўпа дадзеных раздзелах. З іх 4 заданні па складаным сказе, у тым ліку адно заданне па сказах з рознымі відамі сувязі.

Згодна класіфікацыі, у граматыцы выдзяляюцца наступныя віды складаных сказаў:

1) складаназлучаныя;

2) складаназалежныя;

3) бяззлучнікавыя;

4) сказы з рознымі відамі сувязі.

Пры выкананні тэставага задання, як паказвае практыка, асаблівую цяжкасць у вучняў выклікаюць сказы з рознымі відамі сувязі.Больш падрабязна спынімся на дадзеных сказах.

Прапаную засяродзіць увагу на колькасці гадзін, адведзеных на вывучэнне гэтай тэмы вучэбнай праграмай.

| Клас | Раздзелы вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 9 | Сладаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне | 9 |
| 10 | Тэкст ( асобных гадзін не выдзяляецца) | 2 |
| 11 | Сінтаксічныя прыметы складаных сказаў, сказаў з рознымі відамі сувязі | 5 |

Як бачым, са сказамі з рознымі відамі сувязі вучні ўпершыню знаёмяцца ў 9 класе. На вывучэнне тэмы адводзіцца дзевяць гадзін. У 10 класе навыкі работы з такімі сказамі адпрацоўваюцца ў межах тэмы“Тэкст”, на паўтарэнне якой адводзіцца толькі тры гадзіны. Падчас работы з тэкстам, засяроджваецца ўвага на такіх сказах, узнаўляюцца навыкі пабудовы схем і пастаноўкі знакаў прыпынку. У 11 класе на паўтарэнне тэмы “Сінтаксічныя прыметы сказаў з рознымі відамі сувязі”адводзіцца дзве гадзіны. Узгадваюцца схемы, пастаноўка знакаў прыпынку. Далей са сказамі з рознымі відамі сувязі вучні сустракаюцца толькі пры напісанні экзаменацыйнага пераказу і выкананні тэставага задання.

На мой погляд, на ўроку авалодаць трывалымі навыкамі работы з такой разнавіднасцю складанага сказа для вучня дастаткова складана. Па тэме неабходна працаваць яшчэна факультатыўных занятках, праводзіць падтрымліваючыя заняткі, індывідуальныя заняткі.

Прапаную звярнуць увагу на прыклад тэставага задання ( ЦТ 2015, В2).

А 27.Адзначце схему, якая адпавядае прыведзенаму сказу ( улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены):

У ранішнім лесе не дзеля забавы з бярозкі на бярозку куляй перашмыгвалі чорныя, быццам у сажы, шпакі і заўзята барабанілі па дрэвах сваімі вострымі дзюбамі даўгахвостыя дзятлы павінны птушкі клапаціцца пра сняданак для сябе і для сваіх птушанят.

1. [ ] і [ ]: [ ].
2. [ ], і [ ]:[ ].
3. [ ], і [ ] – [ ].
4. [ ] – і [ ]:[ ].
5. [ ], і [ ], [ ].

Што павінен ведаць вучань, каб вылучыць сярод прапанаваных сінтаксічных канструкцый сказ з рознымі відамі сувязі? Я прапаную вучням памятку**.**

***Памятка для вучня***

1. У сказе павінна быць тры або больш прэдыкатыўныя часткі, звязаныя паміж сабой рознымі відамі сувязі: злучальнай і падпарадкавальнай, злучальнай і бяззлучнікавай, падпарадкавальнай і бяззлучнікавай.
2. У некаторых сказах гэтага тыпу для аб’яднання прэдыкатыўных частак выкарыстоўваюцца ўсе тры віды сувязі – злучальная, падпарадкавальная, бяззлучнікавая.
3. Прэдыкатыўныя часткі складаных сказаў з *рознымі відамі сувязі аб’ядноўваюцца паміж сабой і ўтвараюць структурныя часткі.*

Вучні ўпершыню карыстаюцца дадзенай памяткай у 9 класе пры вывучэнні тэмы “Сказы з рознымі відамі сувязі”, а далей і ў 10,11 класах пры паўтарэнні тэмы. Таксама мэтазгодна карыстацца ёй на дадатковых занятках.

Для адпрацоўкі навыкаў работы з памяткай прапаную наступныя практыкаванні.

*Практыкаванне 1.Вызначце колькасць прэдыкатыўных частак у сказе, графічна абазначыўшы граматычныя асновы*( ЦТ 2010, В1).

1.Ноч, сплыў сад у цемру, а я падкінуў дроў у печку і запаліў святло.

2.Лёгкі ранішні ветрык песціў загоны жыта, што падступала да самай сцежкі, і яно ціха шумела сівым калоссем.

3. Вось чаго ў жыцці я не зраблю ніколі: не прадам я сэрца,не падам я волі, не прадам я песні, хоць бы мне за гэта каля ног зложылі скарбы ўсяго свету.

*Практыкаванне 2.Адзначце сказ, у якім прэдыкатыўныя часткі звязаны паміж сабой злучальнай і бяззлучнікавай відамі сувязі* ( ЦТ 2010, В3-5).

1. Стаялі пагодныя дні, і мы ў вольны час гулялі па вуліцы, ласаваліся яблыкамі, а вечарамі ладзілі танцы, на якія прыходзілі і старыя, і маладыя.
2. Выплача хмара свае слёзы над палямі, сонца засвеціць, і жаўрук запяе.
3. Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста.

*(Адказ 2)*

Са сваёй практыкі падрыхтоўкі вучняў да ЦТ я магу выдзеліць тыповыя памылкі, якія дапускаюць вучні пры выкананні тэставага задання.Гэта няўменне размежаваць сэнсавыя часткі, вызначыць адносіны паміж імі і віды сувязі. Цяжкасці ўзнікаюць ад няўмення вызначыць адрозненні паміж простым ўскладненым сказам і складаным.

**Асноўныя паняцці, неабходныя вучню для працы са сказамі,** наступныя**:** віды сувязі і сэнсавыя адносіны паміж часткамі; структура і парадак размяшчэння частак.

Тэставае заданне патрабуе ад вучня ўмення расставіць знакі прыпынку ў сказе з рознымі відамі сувязі. У такім выпадку вучань павінен ведаць, што пастаноўка знакаў прыпынку ў складаным сказе з рознымі відамі сувязі вызначаеццавідамі сувязі і сэнсавымі адносінамі паміж часткамі;структурай і парадкам размяшчэння частак.

Прапаную вашай увазе распрацаваны мною алгарытм вызначэння сказа з рознымі відамі сувязі частак.

1. Вызначыць колькасць прэдыкатыўных частак.
2. Графічна абазначыць іх від.
3. Вызначыць сродкі сувязі прэдыкатыўных частак.
4. Вызначыць від сувязі прэдыкатыўных частак.
5. Аб’яднаць прэдыкатыўныя часткі ў сэнсавыя часткі.
6. Вызначыць адносіны паміж сэнсавымі часткамі.
7. Расставіць знакі прыпынку.
8. Пабудаваць схему.

Праца з дадзеным алгарытмам праводзіцца да атрымання вучнямі трывалых ведаў па тэме.

Разгледзім на прыкладзе, як карыстацца дадзеным алгарытмам.

**Вызначэнне сказа з рознымі відамі сувязі частак**

$^{1}$*[Хмаркі падняліся вышэй], і* $^{2}$*[па ўсім было відаць]:* $^{3}$*[будзе добрае надвор’е].*

1. У сказе тры прэдыкатыўныя часткі.
2. Графічна абазначаны іх від.
3. Сродкамі сувязі прэдыкатыўных частак з’яўляюцца злучальны спалучальны злучнік ***і*** і інтанацыя.
4. Паміж прэдыкатыўнымі часткамі існуе злучальная і бяззлучнікавая сувязь.
5. Прэдыкатыўныя часткі аб’ядноўваюцца ў дзве сэнсавыя часткі.
6. Адносіны паміж сэнсавымі часткамі – спалучальныя.
7. У межах другой сэнсавай часткі ставім двукроп’е, бо трэцяя прэдыкатыўная частка дапаўняе, раскрывае, удакладняе змест другой прэдыкатыўнай часткі, паміж першай і другой сэнсавымі часткамі ставім коску перад спалучальным злучнікам ***і.***
8. Схема сказа будуецца толькі тады, калі адпрацаваны і растлумачаны першыя 7 пунктаў алгарытму:

I, і [ ] [ ] : [ ]

Як бачна, тэма гэта складаная і аб’ёмная. Я думаю, (настаўнікі будуць са мной згодны) асновы для выканання гэтага задання закладаюцца ў 9 класе. Безнавыкаў па рабоце са складаназлучанымі, складаназалежнымі, бяззлучнікавымі складанымі сказамі цяжка справіцца са сказамі з рознымі відамі сувязі**.** З заданнем № 27 цесна звязаны і заданні № 24-26 (нумары заданняў у тэстах ЦТ (згодна спецыфікацыі) могуць быць зменены). Гэтыя заданні патрабуюць пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаных сказах. Вашай увазе прапаную модулі, у якіх адлюстраваны этапы адпрацоўкі навыкаў пастаноўкі знакаў прыпынку. Працуючы з модулямі, адпрацоўваем уменні ставіць знакі прыпынку у складаных сказах.

1. Вызначаем спачатку віды сувязі паміж часткамі ў сказе з рознымі відамі сувязі.

Калі сувязь злучальная, карыстаемся модулем **1**.

**Модуль 1**

**Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе**

1. [], і [].

[ ], але [ ].

то [], то [].

2. [агульнае для 2-х частак слова] і [].

[агульнае для 2-х частак слова] ды [].

[агульнае для 2-х частак слова] ці [].

[агульнае для 2-х частак слова] або [].

3. []– і [ хуткая змена падзей, нечаканы вынік].

[аднасастаўны сказ] – і [ ].

4. [ , , , ]; і [ , , , ].

Для адпрацоўкі навыкаў па рабоце з першым модулем прапаную вучням наступнае практыкаванне.

*Практыкаванне 1.Адзначце сказы , якія адпавядаюць трэцяму пункту модуля*( ЦТ 2014, В1-2).

1. *Над сажалкай сіняй начаваў месяц і свяцілі зоркі ярка.*

2. *Зірну на апошні бярозавы ліст і сэрца ціха зашчыміць.*

3. *У Еўропу бульба трапіла ў шаснаццатым стагоддзі і доўгі час яна была проста дэкаратыўнай раслінай.*

4. *Адарвецца кветка ад карэння і не чакай ні плода, ні насення.*

*(Адказ 2,4)*

Калі сувязь падпарадкавальная, карыстаемся модулем **2**.

**Модуль 2**

**Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе**

1. (Што… ), [ ].

[], (што… ).

[ ,(што…), ].

2. [], (што… ) і (што…).

3. Пры збегу двух падпарадкавальных злучнікаў карыстаемся “правілам трохкутніка”:

**то** ,



**што калі што калі**

*Васіль Ведаў, **што калі** ўпадзе ў снег, **то** ўжо не ўстане.*

*Ён ведаў, **што, каб** чаго-небудзь дабіцца, трэба адольваць страх.*

Для замацавання ведаў пры рабоце з другім модулем прапаную вучням наступнае практыкаванне.

<u>Практыкаванне 1.</u>*Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі)* ( ЦТ 2016, В1).

1. Некалі людзі лічылі, што пражыванне вужа пад падлогай прыносіць у хату ўдачу _ і што знішчэнне такога вужа небяспечнае для гаспадароў.

2. Кажуць, што _ калі да палавіны кастрычніка з бярозы лісце не ўпала, то снег ляжа позна.

3. У бераг высокі _ дзе лозы растуць _ за хвалямі хвалі бягуць і бягуць.

4. Праз якую старонку пабяжыць жыццёвая сцежка _ падказаць можа толькі сэрца.

5. Зноў чаруе сваім водарам язмін _ з кветак якога гатуюць духмяную гарбату.

*(Адказы 3,4,5)*

Калі сувязь бяззлучнікавая, карыстаемся модулем 3.

**Модуль 3**

**Знакі прыпынку ў складаным бязлучнікавым сказе**

1. [ ], [ ]. (адначасовасць, паслядоўнасць падзей)

2. [ ]: [ ]. (: = а іменна)

[ ]: [ ]. (: = бо, таму што)

[ ]: [ ]. (: = што, як)

[ ]: [ ]?

3. [ ] – [ ]. = (Калі…), [ ].

[ ] – [ ]. (– = і, аж)

[ ] – [ ]. (– = а, але, аднак)

[ ] – [ ]. (– = як, быццам, як быццам)

[ ], [ ] – [абагульненне].

[ ] – [ гэта, то, так, такі… ].

Для адпрацоўкі навыкаў па рабоце з трэцім модулем прапаную вучням наступнае практыкаванне.

*Практыкаванне 1.Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е*( ЦТ 2018, В2).

1. Стаяла хмара нерухома над жытам спелым _ ад першага ўдару грому яна аж пачарнела.

2. Восенню я абавязкова гатую кампот з каліны _ ён не толькі смачны, але і вельмі карысны.

3. Кранеш рукой маліны куст _ звон адчуецца малінавы.

4. Цікавы, на мой погляд, наступны факт _ парашком з ядра каштана можна адбяліць зубы на адзін тон.

5. Павінны з дзяцінства ўсе ведаць _ добрага дня, выйшаўшы з дому ранкам, пажадаць трэба і суседу, і дворніку з мятлой каля ганка.

*(Адказы 2,4,5)*

<u>Практыкаванне 2.</u>*Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказа не пастаўлены):[ ]:[ ]*( ЦТ 2017, варыянт 1 А26).

1. Адчыняю матуліну шафу і разумею ўсё новае – гэта даўно забытае старое.
2. Тата расказаў мне цікавую рэч салаўі доўга, каля трох гадоў, вучацца спяваць.
3. Рапуха нездарма выдзяляе праз скуру слізь яна, не маючы ні вострых зубоў, ні хуткіх ног, ратуецца такім спосабам ад ворагаў.
4. Вярба рана інеем пакрываецца будзе працяглая зіма.
5. Вечар сінявою прычалы ахутаў сумна чайка крыкнула ў цішы.

*(Адказы 1,2,3)*

Выкарыстанне дадзеных модуляў найбольш эфектыўна пры абагульненні і паўтарэнні вывучанага матэрыялу. Яны даказалі сваю эфектыўнасць пры падрыхтоўцы вучняў да ЦТ. ‘

Такім чынам, у вучняў, якія маюць добрыя веды і навыкі па рабоце са знакамі прыпынку ў складаназлучаных, складаназалежных і бяззлучнікавых сказах, як правіла, праблем не існуе і са складаным сказам з рознымі відамі сувязі. А такі падыход да працы са складанымі сказамі дазваляе ўсебакова паўтарыць і замацаваць матэрыял у 10-11 класах.

Лічу неабходным адзначыць, што, каб своечасова заўважыць прабелы, паўтарыць і замацаваць вучэбны матэрыял, настаўніку неабходна прывесці ў сістэму не толькі работу з вучнямі, але і ўдасканальваць свае навыкі,

праводзіць самадыягностыку і карэкцыйную работу па павышэнні свайго прафесійнага ўзроўню.

Толькі ўсебаковы і сістэмны падыход у падрыхтоўцы вучняў да ЦТ прыводзіць да 100-бальнага выніку.

## ЛІТАРАТУРА

1. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова:зборнік тэстаў/ Рэсп.ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп.Беларусь. – Мінск:Аверсэв, 2010, 2014, 2015, 2016, 2017, 2018.